Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт музычнага мастацтва
Кафедра беларускай народна-песеннай творчасці

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедрай
___________Л.Л. Ражкова
___ ____________20___ г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
__________І.М. Грамовіч
___ ____________20___ г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ВАКАЛЬНЫ АНСАМБЛЬ

для спецыяльнасці 1-16 01 10 Спевы (па напрамках),
напрамку спецыяльнасці 1-16 01 10-02 Спевы (народныя)

Складальнік:
Снапкова Ларыса Віктараўна
Раманенкава Вераніка Іванаўна

Разгледжана і зацверджана
на пасяджэнні Савета ўніверсітэта 17.11.2017 г.
пратакол № 3

Складальнік:

*СНАПКОВА Л.В., дацэнт кафедры белорускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;*

*РАМАНЕНКАВА В.І., выкладчык кафедры народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».*

Рэцэнзенты:

*Кафедра міжкультурнай камунікацыі прыватнай ўстановы адукацыі «Інстытут сучасных ведаў імя А.М. Шырокава»;*

*Шэдава А.В., загадчык кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў».*

Разгледжаны і рэкамендаваны да зацвярджэння:

*Кафедрай беларускай народна-песеннай творчасці*
*(пратакол ад 16.05.2017 № 10);*

*Саветам факультэта музычнага мастацтва*
*(пратакол ад 29.05.2017 № 9)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЗМЕСТ**


1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ……………………………………….......... 4

2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ …………………………………………….. 6
2.1 Вакальная характарыстыка народнай манеры спеваў……………… .. 6
2.2 Жанравая сістэма беларускага фальклору …………………….......... 7

3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ ……………………………………………… 10
3.1 План правядзення заняткаў па дысцыпліне……................................. 10
3.2 Ансамблевыя спевы: вакальныя практыкаванні …………………… 11

4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ ……………………………………... 13
4.1 Патрабаванні да экзаменаў і залікаў па дысцыпліне………………. 13
4.2 Пытанні для самастойнай працы студэнтаў……………………….. 14
4.3 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў……………... 15

5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ …………………………….................... 17
5.1 Вучэбная праграма ……………………………………………........... 17
5.2 Метадычныя рэкамендацыі па авалоданні народнай манерай спеваў.. 26
5.3 Асноўная літаратура……………………………………………………….. 36
5.4 Вучэбна-метадычная літаратура …………………………………….. 36
5.5 Дадатковая літаратура …………………………………………………….. 37


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліна “Вакальны ансамбль” з’яўляецца адной з асноўных у падрыхтоўцы будучых выканаўцаў народнай песні.

У аснове вучэбнай работы па прадмету “ Вакальны ансамбль” ляжыць вывучэнне абласных пеўчых стыляў, глыбокае пранікненне ў выканаўчую традыцыю як мясцовую, так і гарадскую. Эфектыўнасць выкладання дысцыпліны ажыццяўляецца ва ўзаемадзеянні з такімі дысцыплінамі, як “ “Аранжыроўка беларускіх народных песен”, “Расшыфроўка беларускіх народных песен”, “Выканальніцкае майстэрства”,”Асновы сценруху, танец”.

Спевы ў ансамблі маюць сваю спецыфіку, якая зыходзіць з асаблівасцей творчага працэсу гэтага жанру. Фактам, які вызначае выканальніцкую спецыфіку вакальнага ансамбля, з’яўляецца творчае адзінства індывідуальнага і калектыўнага пачатку ў спевах. Гэта патрабуе ад спевака-ансамбліста павышаную адказнасць за ўзровень свайго майстэрства, так як у адрозненні ад харыстаў, удзельнікі ансамбля выконваюць сваю партыю ў шматгалоссі самастойна, што налагае на яго асаблівую адказнасць.

Мэта вучэбнай дысцыпліны “ Вакальны ансамбль” – даць будучаму спецыялісту неабходныя веды па засваенні традыцыйнай і сцэнічнай манер народных ансамблевых спеваў, па авалоданні навыкамі і ўменнямі раскрыцця вобраза народнай песні, выхаваць высокаадукаванага спецыяліста ў сферы народнапесеннага выканальніцтва.

Заняткі па “ Вакальнаму ансамблю” павінны прывіваць павагу і любоў да народнапесенных традыцый, самастойнасці выканання, развіваць навыкі практычнай работы ў ансамблі.

Важнай часткай вакальнага ансамбля з’уляецца канцэртна-выканальніцкая дзейнасць, якая дысцыплінуе і стымулюе навучальны працэс.. Неабходнай умовай дасягнення прафесійных вынікаў з’яўляецца ўважлівая і актыўная работа студэнтаў і патрабавальнасць выкладчыка да дакладнага выканання яго рэкамендацый на занятках. Яны маюць дакладную зместавую накіраванасць як для студэнтаў, так і для выкладчыка. Якасць гучання і выканальніцкая культура ўдасканальваюцца ў выніку сістэматычных рэпетыцый і канцэртнай дзейнасці. Рэкамендуецца праслухоўванне фаназапісаў народных выканаўцаў, запрашэнне выканаўцаў – носьбітаў традыцыйнага выканальніцтва на рэпетыцыі, якія дапамогуць у засваенні аўтэнтычнай манеры спеваў.

Для найбольш эфектыунага засваення матэрыяла па дысцыпліне “ Вакальны ансамбль” ужываюцца вучэбна-даследчыя тэхналогіі, якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадугледжваюць вывучэнне дыялектных асаблівасцей рэгiёнаў Беларусі, прыёмы вымаулення паэтычнага тэксту и авалодванне народнай манерай спеваў (мясцовыя пеучыя традыцыі, перайманне “з голасу”, сувязь спевау з асаблівасцямі дыялекта).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 2.1 Вакальная характарыстыка народнай манеры спеваў

Мастацтва народных харавых спеваў звязана з народнай песняй. Песенная спадчына Беларусі адлюстроўвае гісторыю народа, яго быт, думы, настроі.

Беларускае народна-харавое выканальніцтва сфарміравалася ў выніку працяглай і сістэматычнай пеўчай практыкі. Асновай гукаўтварэння народнага голасу з'яўляецца размоўны пасыл гуку, карыстанне гукамі груднога рэгістра. Для народнага спеву хаоактэрным з'яўляецца натуральны, блізкі гук з нязначнай вібрацыяй або без яе; выкарыстанне аднаго рэгістра (часцей за ўсё груднога), некаторая абмежаванасць дыяпазону. Асобна трэба вылучыць такія тыповыя "ўпрыгожванні" гуку ў народная манеры спеваў, як фаршлагі, "слізганні", "скаты", "узлёты". Пры выкананні народнях песен спевакі могуць разрываць словы дыханнем, паўтараць склады слова, трансфармаваць словы, "агаласоўваць" зычныя літары.

Акрамя непасрэдна вакальных характарыстык народнага спева існуіць і іншыя фактары вызначэння народнага выканальніцтва:

- Апора на мясцовую пеўчую традыцыю - двухрэгістравае гучанне, актаўныя падваенні асноўнай мелодыі.
- Імправізацыя выканання - спевакі дапускаюць падчас спеваў мелодычныя падгалосак, імправізуюць.
- Натуральная манера гукаўтварэння - гук адкрыты светлы, жаночая група галасоў спявае ў нізкім рэгістры, а мужчынская наадварот.
- Выкарыстанне прымарнаго (натуральнага) рэгістра галасоў - колькасная перавага жаночых галасоў над мужчынскімі, выкананне імі асноўны вакальнай нагрузкі, спевы без дырыжора.
- Рэпертуар - народныя, абрадавыя песні, прыпеўкі, творы самадзейных кампазітараў, творы прафесійных кампазітараў стылізаваных пад народныя.

Нельга не адзначыць што наша музычная адукацыя арыентуецца на агульнаеўрапейскую ці рускую манеру выканання з іх раздзяленне галасоў на сапрана, альты, тэнары і басы. У народзе так ніколі не спявалі і не спяваюць. Арыентацыя на прафесійнае выкананне народнай музыкі, дрэннае веданне асноў народных спеваў, неналежная адукаванасць кіраўнікоў зрабіла іх па сваёй сутнасці ***псеўданароднымі.***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Старажэтная і “натуральная” манера беларускага народнага спеву – аўтэнтычная. Тэрмін “аўтэнтычнасць” існуе для абазначэння першасных, традыцыйных, рэгіянальна-спецыфічных відаў культуры. Фальклор аўтэнтычны – гэта фальклор сапраўдны ў сваёй сутнасці і натуральным бытаванні, характэрны для канкрэтнай мясцовасці. Ён захоўвае ўсе свае спецыфічныя рэгіянальныя рысы, якія вызначаюцца рэгіянальнай традыцыяй; характарызуецца ўстойлівым жанравым складам, рэпертуарам, стылем, манерай выканання і г.д. Адарваны ад свайго асяроддзя, перанесены на сцэну або на іншую этнічную глебу, апрацаваны, ён губляе свае спецыфічныя якасці.

Аўтэнтычны фальклор з’яўляецца культурай вуснага тыпу са спецыфічнымі формамі бытавання і пераемнасці. Асноўным прынцыпам яго натуральнага бытавання з’яўляецца вуснае пераймание. Засваенне ведаў і ўменняў у межах традыцыі ажыццяўлялася шляхам назірання, капіравання, сумеснай дзейнасці майстра і вучня. Міжпакаленная трансмісія праз вусны спосаб навучання ў этнапедагогіцы носіць назву дэманстрацыйнай антрапатэхнікі.

## 2.2 Жанравая сістэма беларускага фальклора

Музычны фальклор – песенная і інструментальная творчасць народа. Творы народнай музыкі ўзнікаюць на аснове мастацкіх традыцый і адлюстроўваюць калектыўна выпрацаваныя эстэтычныя прынцыпы. Абагульняючы і зберагаючы вопыт многіх пакаленняў, народная музыка мае вялікае эстэтычнае, пазнавальнае і выхаваўчае значэнне. Вядучае месца ў беларускай музычнай культуры займае песенная творчасць, якая ахоплівае некалькі вялікіх гістарычных пластоў.

Песенны фальклор, у сваю чаргу, прадстаўлены разгалінаванай сістэмай жанраў. Такую сістэму жанраў прадстаўляе В. Проп. Гэта сістэма жанраў абаснавана іерархічным законам дзялення з драбленнем кожнай адзінкі абрада паводле: напачатку жанравай вобласці або жанравай групы, затым жанравыя цыклы і ўжо пасля іх пойдуць жанравыя «сем’і» і, нарэшце, гістарычна і геаграфічна канкрэтныя уласна жанры. Напрыклад:

1. абрадавы фальклор
2. абрадавыя песні
3. каляндарныя песні
4. песні вясновага каляндарнага цыклу
5. вяснянкі
6. вяснянкі-заклічкі Паазер’я, Палесся і г.д.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Песенны фальклор адпаведна дадзенай сістэмы дзялення жанру падзеліцца на:

- ✓ Каляндарна-абрадавы цыкл:
  - зіма (піліпаўскія песні, калядныя песні, шчадроўкі);
  - вясна (масленечныя песні, песні загукання вясны, валачобныя песні, траецкія песні, юраўскія песні, русальныя песні, мікольскія песні);
  - лета (купальскія песні, пятроўскія песні, жніўныя (зажыначныя, жніўныя і дажыначныя);
  - восень (ільняныя песні, талочныя песні).

- ✓ Сямейна-абрадавы цыкл:
  - радзінныя песні:
    - хрэсбінныя песні (велічальныя, жартоўныя, застольна-бяседныя);
    - заклінальныя песні;
    - іесні «за калыскай».
  - вясельныя песні:
    - песні прымеркаваныя абраду сватання;
    - песні прымеркаваныя абраду заручын і запоін;
    - песні прымеркаваныя абраду каравая;
    - песні прымеркаваныя абраду зборнай суботы;
    - песні прымеркаваныя абраду «пасад»;
    - песні прымеркаваныя абраду выпраўленне маладых да шлюбу;
    - песні прымеркаваныя абраду «шлюб»;
    - песні прымеркаваныя абраду застольных урачыстасцяў;
    - песні прымеркаваныя абраду «пярэзвы».
  - пахавальныя галашэнні.

- ✓ Пазаабрадавы цыкл:
  - песні пра каханне;
  - сямейна-бытавыя песні (кірмашовыя песні, бяседныя песні, “у піве” песні, “у гасціне” песні);
  - сацыяльна-бытавыя песні (салдацкія, рэкруцкія, казацкія, чумацкія, бурлацкія, прымацкія, батрацкія, басяцкія, сірочыя, удовіны песні).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- жартоўныя песні,
- гістарычныя песні,
- баладныя песні,
- прыпеўкі.

✓ Дзіцячы фальклор:
- забаўлянкі,
- дзіцячыя песні,
- калыханкі.

✓ Рэлігійны музычны фальклор:
- рэлігійныя песні,
- канты,
- духоўныя вершы
- паставыя песні.

✓ Песні змагання:
- паўстанцкія песні,
- песні сялянскай вольніцы,
- партызанскія песні.

✓ Песні савецкага часу.

✓ "Жорсткі" раманс.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1 План правядзення заняткаў па дысцыпліне

Асноўная форма вучэбнай і выхаваўчай работы – урок, звычайна ўключае ў сябе праверку выкананага задання, сумесную працу педагога і студэнта над песняй, рэкамендацыі педагога адносна спосабаў самастойнай працы ўдзельнікаў ансамбля. Урок можа ўключаць у сябе некалькі форм дзейнасці:

- праца над вакальным і артыкуляцыйнай апарата;
- пастаноўка дыхання;
- разбор музычнага матэрыялу па партыях;
- праца над партытурай;
- пастаноўка канцэртных нумароў і да т.п.

Праца ў класе, як правіла, спалучае слоўнае тлумачэнне з вакальным паказам неабходных фрагментаў музычнага тэксту, а таксама праслухоўваннем першакрыніц.

Важнейшыя педагагічныя прынцыпы паступовасці і паслядоўнасці ў вывучэнні матэрыялу патрабуюць ад выкладчыка прымянення розных падыходаў да студэнтаў, якія залежаць ад інтэлектуальных, фізічных, музычных і эмацыйных дадзеных студэнта, а таксама ад узроўня яго вакальнай падрыхтоўкі.

На рэпетыцыях вакальнага ансамбля і на індывідуальных занятках, выкладчыкам павінен вырашацца цэлы шэраг задач:

- фарміраванне вакальна-выканальніцкага апарата навучэнца;
- выхаванне гукавой культуры, выразнасці, прыгажосці і пявучасць гучання;
- праца над найважнейшымі сродкамі музычна-мастацкага выканання (дакладнасць прачытання музычнага тэксту, выразнасць інтанацыі, рытмічная выразнасць, захаванне дынамікі, фразіроўкі.)

Правільная арганізацыя навучальнага працэсу, паспяховае і ўсебаковае развіццё музычна-выканальніцкіх дадзеных студэнтаў залежаць непасрэдна ад таго, наколькі старанна спланаваная работа ў цэлым, глыбока прадуманы выбар рэпертуару.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### 3.2 Ансамблевыя спевы: вакальныя практыкаванні

Вакальныя практыкаванні можна падзяліць на некалькі груп:

1. Практыкаванні для працы дыяфрагмы, разагрэву галасавога апарату.

За аснову бяруцца пэўныя склады, якія агучваюцца дзякуючы выштурхоўванню гуку прэсам (с-с-сэт, з-з-хэт, ха-хо-хэ);

2. Практыкаванні на скачкападобныя элементы. У працэсе спявання выпрацоўваецца цягліцавая памяць, што ў далейшым дапаможа пры выкананні складаных элементаў у песнях. За аснову бяруцца склады: я-ха-ха-ха-ха і прапяваюцца па трохгуччу ўверх ці ўніз;

3. Практыкаванні на рухомасць гартані. Дзякуючы гэтым практыкаванням выкананне мелізмаў, вакальных упрыгожванняў стане рэальным. Рухомасць гартані здабываецца пры практыкаванні "шырокі зявок", калі максімальна раскрываецца зеў;

4. Практыкаванні на мажора-мінорныя адчуванні мелодыі, а таксама на разуменне пабудовы ангеметонных ладоў. Часта выкананне пэўных ступеняў ладоў гучаць фальшыва з-за адсутнасці танальнай прыхільнасці, няслушнага інтанавання. Практыкавання засноўваюцца на тым ці іншым спалучэнні ладавых гукаў і будуюцца ад розных нот.

5. Практыкаванне на канцілену, ланцужковае дыханне. У складзе такіх практыкаванняў спалучаюцца скачкі з апяваннямі. Выконваюцца на любыя склады (лё, лю, мо, ма і г.д.). У дадзеных практыкаваннях павінна прысутнічаць адчуванне рытмікі калыханкі, заснаванай на працяжным гукавядзенні.

6. Практыкаванні для дыкцыі. Спалучэнні слоў, якія складана вымаўляюцца выконваюцца, як правіла, на простых гуках, якія паўтараюцца. Дадзеныя практыкаванні з'яўляюцца ў пэўным сэнсе речытацыяй, якою можна гарманізаваць на сваё меркаванне. Для дакладнай дыкцыі выкарыстоўваюцца практыкаванні на стаката і пульсаванае гукавядзенне.

7. Практыкаванні з фрагментамі развучвання твораў. Практыванні, пабудаваныя на асобных фрагментах развучвання твораў, спрыяюць засваенню і замацаванню складаных элементаў, характэрных менавіта для дадзенага творы; дапамагаюць пераадолець канкрэтныя цяжкасці ў тым ці іншым творы. Асновай такі практыкаванняў могуць быць распяванні пабудаваныя на складаных урыўках з песен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. Практыкаванні на выпрацоўку вакальных прыёмаў. Субтон – гук з паветрам. Каб яго адчуць, трэба вымавіць слова “не хвалюйся”, працягваючы апошні склад з паветрам. Таксама можна прапявать дадзенае слова, выкарыстоўваючы скачок ўніз.

9. Народны гук – гук, які пасылаецца на верхняе нёба і роўным моцным пасылам паветна выходзіць на паверхню губ, ствараючы адчуванне “блізкага гуку”.

10. Практыкаванні на шматгалоссе. За аснову бярэцца выкананне трэхорда ў такія інтэрвалы, як тэрцыя або сэкста. Таксама можна ўключыць кананічнае выкананне – пачарговае ўступленне галасоў.

Асаблівая ўвага павінна надавацца працы над дынамічнай раўнавагай ў ансамблі. Уменне чуць гучанне ансамбля ў цэлым і гучанне сваёй партыі і партыі партнёра ўяўляе значную цяжкасць. Не варта абыходзіць увагай выкананне практыкаванняў a cappella для развіцця ўнутранага слыху, чысціні інтанавання і танальнага адчування.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## 4.1 Патрабаванні да экзаменаў і залікаў па дысцыпліне

Для вакальнага ансамбля прапануецца вывучэнне да залікаў і экзаменаў трох-чатырох твораў з суправаджэннем і без суправаджэння. Гэта могуць быць рознахарактарныя народныя песні ў апрацоўках або песні ў "чыстым" арыгінальным аўтынтычным выглядзе для ансамблевага выканальніцтва.

Да экзамена або заліка студэнт павінен прадставіць наступную праграму:

3 курс выконвае дзве песні (без і з суправаджэннем). Гэта могуць быць дзве рознахарактарныя народныя песні ў апрацоўцы або нескладаныя аўтарскія творы.

На залік або экзамен студэнт павінен прадаставіць наступную праграму: тры-чатыры творы – расшыфроўка або апрацоўка беларускіх народных песень, арыгінальныя аўтарскія кампазіцыі, напісаныя для народнага голасу.

4 курс прадастаўляе наступную праграму:

- тры-чатыры творы разнастайныя па характару і жанрам;
- абавязковыя: аўтарская песня, народная песня ў апрацоўцы з шырокім спеўным дыяпазонам і развітай драматургіяй.

5 курс на экзамен прадастаўляе тры творы:

- апрацоўка беларускай народнай песні;
- традыцыйная рэгіянальная песня;
- аўтарскі твор.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.2 Пытанні для самастойнай працы студэнтаў

3 курс

- валоданне пеўчым дыханнем
- праца над дыкцыяй
- выпрацоўка чыстай і дакладнай інтанацыі
- работа над плаўным гукавядзеннем
- засваенне ўсіх відаў атакі (мяккай, цвёрдай, прыдыхальнай)

Форма кантроля – апытанння студэнтаў на практычных занятках.

4 курс

- замацаванне вакальна-тэхнічных навыкаў (дыкцыя, дыханне, гукавядзенне, атакі, дынаміка, фразіроўка)
- знаёмства з асаблівасцямі дыялектаў
- засваенне рэгіянальных прыёмаў народнага гукаўтварэння
- развіццё навыкаў выканання аўтэнтычнага спеўнага матэрыялу

Форма кантроля – апытанння студэнтаў на практычных занятках.

5 Курс

- авалоданне навыкамі імправізацыі і самастойнай рэжысуры народнай песні
- шліфоўка і далейшае развіццё вакальна-тэхнічных навыкаў і ўменняў
- пошук свайго выканальніцкага стылю
- фарміраванне творчай асобы спевака
- актыўны ўдзел у канцэртах

Форма кантроля – правядзенне тэхнічнага заліка-кантэрта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.3 Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

| БАЛЫ | ПАКАЗЧЫКІ АДЗНАК |
|---|---|
| 1 (адзін) | Адсутнасць ведаў па дысцыпліне ў рамках адукацыйнага стандарта; слабыя вакальныя даныя; адмаўленне ад выканання праграмы. |
| 2 (два) | Слабыя веды па дысцыпліне ў рамках адукацыйнага стандарта; адсутнасць здольнасці да дакладнага інтанавання; нізкі ўзровень культуры выканання вакальных твораў. |
| 3 (тры) | Фрагментарныя веды ў рамках адукацыйнага стандарта; пасіўнасць на практычных занятках; няўменне арыентавацца ў музычным матэрыяле; вузкі мастацкі кругагляд, невыразныя вакальныя даныя; няўстойлівая ітанацыя; дрэнная дыкцыя; слабае пеўчае дыханне і апора; няўпэўненае выкананне вакальнай партыі; няўмелае валоданне элементамі руху пры раскрыцці сцэнічнага вобразу беларускай народнай песні. |
| 4 (чатыры) | Недастаткова поўны аб'ём ведаў у рамках адукацыйнага стандарта; пасрэдныя вакальныя даныя; недастаткова яскравы тэмбр голасу; няўстойлівая інтанацыя; невыразная дыкцыя; няўменне эканомна карыстацца пеўчым дыханнем; недастаткова ўпэўненае выкананне вакальнай партыі; павярхоўнае разуменне паэтычнага тэксту і агульнай драматургіі вакальнага твора; слабае валоданне элементамі руху пры выкананні народных песен. |
| 5 (пяць) | Дастатковы аб'ём ведаў у рамках адукацыйнага стандарта; засваенне рэкамендаванай вучэбнай праграмы дысцыпліны; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі; сярэднія вакальныя даныя; некаторыя недахопы тэмбра голаса; пэўныя дэфекты дыкцыі; няўмелае карыстанне ланцужковым дыханнем; няўменне прыстасоўваць свой голас да агульнай манеры спеваў; дапушчэнне памылак пры выкананні сваёй вакальнай партыі; слабае валоданне дынамічнымі адценнямі; недастатковае разуменне паэтычнага тэксту; няўпэўненае ўвасабленне сцэнічнага вобраза. |
| 6 (шэсць) | Дастаткова поўныя веды ў рамках адукацыйнага стандарта; дастатковыя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы дысцыпліны; актыўнасць на практычных занятках; дастатковы ўзровень культуры выканання вакальных твораў; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі; пасрэдныя вакальныя даныя; цьмяны і невыразны тэмбр голасу; некаторыя памылкі пры выкарыстанні пеўчага дыхання; невыразная дыкцыя; недасканалае ўменне прыстасоўваць свой голос да адзінай манеры выканання; недасканалае валоданне дынамічнымі адценнямі; няпоўнае выкананне патрабаванняў па самастойнай рабоце над вакальным творам. |
| 7 (сем) | Дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы; засваенне асноўнай літаратуры па дысцыпліне і выкарыстанне навуковай тэрміналогіі; недастатковая арыентацыя ў канцэпцыях і накірунках па дысцыпліне; актыўная самастойная работа на практычных занятках; дастатковы ўзровень культуры выканання вакальных твораў; нязначныя недахопы тэмбру голаса; добрая дыкцыя; нязначныя памылкі пры |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | ланцужковым дыханні; уменне спяваць у ансамблі з другімі партыямі; правільнае разуменне паэтычнага тэкста; не зусім дасканалае ўвасабленне сцэнічнага вобразу вакальнага твора; нядрэннае валоданне народнай харэаграфіяй. |
| 8 (восем) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсім раздзелам вучэбнай праграмы; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматнае ізлажэнне матэрыялу; уменне валодаць голасам; уменне арыентавацца ў накірунках па дысцыпліне і даваць ім параўнаўчую адзнаку; актыўная самастойная работа на практычных занятках; дастаткова высокі ўзровень культуры выканання музычных твораў; добрыя вакальныя даныя; дастаткова яскравы тэмбр голасу; чысціня інтанавання; добрая дыкцыя; правільнае пеўчае дыханне і апора; уменне спяваць у ансамблі з другімі вакальнымі партыямі; упэўненае веданне сваёй партыі ў вакальным творы; уменне дастаткова валодаць народнай мелізматыкай; дастаткова правільнае разуменне паэтычнага тэксту пры дапамозе якога раскрываецца драматургія вакальнага твору і яго сцэнічны вобраз. |
| 9 (дзевяць) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па дысцыпліне ў рамках адукацыйнага стандарта; дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматнае ізлажэнне матэрыялу; уменне арыентавацца ў накірунках па дысцыпліне і даваць ім параўнаўчую адзнаку; актыўная самастойная работа на практычных занятках; высокі мастацкі ўзровень выканання вакальных твораў; выдатныя вакальныя даныя; яркі тэмбр голасу; выдатнае інтанаванне; выразная дыкцыя; граматнае валоданне пеўчым дыханнем; адчуванне ансамбля вакальных партый; высокі ўзровень раскрыцця драматургіі народнай песні пры дапамозе акцёрскага майстэрства. |
| 10 (дзесяць) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поуныя веды па дысцыпліне ў рамках адукацыйнага стандарта; дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматнае ізлажэнне матэрыялу; уменне арыентавацца ў накіунках па дысцыпліне і даваць ім параўнаўчую адзнаку; актыўная і творчая самастойная работа на практычных занятках; высокі мастацкі ўзровень выканання вакальных твораў; выдатныя вакальныя даныя; яркі і насычаны тэмбр голасу; выдатнае інтанаванне; выразная дыкцыя; граматнае валоданне пеўчым дыханнем; адчуванне ансамбля вакальных партый; высокі ўзровень раскрыцця драматургіі народнай песні; надзвычай выдатныя акцёрскія здольнасці; выдатнае валоданне пластыкай і элементамі народнага танца |

## Сродкі дыягностыкі:

- ✓ Чытанне з ліста вакальных партый;
- ✓ Выканальніцкі аналіз вакальнай партытуры;
- ✓ Вусны экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 5. ДАПАМОЖНА РАЗДЗЕЛ

## 5.1 Тыпавая вучэбная праграма

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы наместнік
Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь
________________А.І. Жук
“____” ________________2011 г.
Рэгістрацыйны № ТД____________/тып.

**Вакальны ансамбль**

**Тыпавая вучэбная праграма**
**для вышэйшых навучальных устаноў**
**па спецыяльнасці 1-16 01 10 Спевы (па напрамках)**
**напрамку спецыяльнасці 1-16 01 10-02 Спевы (народныя)**

УЗГОДНЕНА

Начальнік аддзела навучальных устаноў і работы з творчай моладдзю Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

________________Н.Ю. Шмакава

“____” _________________2011 г.

УЗГОДНЕНА

Начальнік упраўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

_________________Ю.І. Міксюк

“____” _________________2011 г.

Старшыня Вучэбна-метадычнага аб’яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

________________Б.У. Святлоў

“____”_________________2011 г.

Прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце Дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»

__________________В.І. Шупляк

“____” _________________2011 г.

Эксперт-нормакантралёр

_______________ _______________

“____” _________________2011 г.

Мінск 2011



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Складальнік**

*Л.В. Снапкова*, дацэнт кафедры беларускай народнапесеннай творчасці ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**Рэцэнзенты:**

*кафедра* спеваў установы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі”;

*І.К.Абразевіч*, галоўны хармайстар Дзяржаўнай установы “Нацыянальны акадэмічны хор Рэспублікі Беларусь імя Г.І. Цітовіча”, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь

**Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:**

*кафедрай* беларускай народнапесеннай творчасці ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол №2 ад 19.10.2010 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 2 ад 11.11.2010г.);

*навукова-метадычным* саветам па мастацтве музыкі (па напрамках) Вучэбна-метадычнага аб’яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 11 ад 25.11.2010г.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю:

Адказны за выпуск: Л.В.Снапкова

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма “ Вакальны ансамбль “распрацавана для вышэйшых навучальных установ Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарта па напрамку спецыяльнасці 1-16 01 10-02 Спевы ( народныя ).

Дысцыпліна “Вакальны ансамбль” з’яўляецца адной з асноўных у падрыхтоўцы будучых выканаўцаў народнай песні.

У аснове вучэбнай работы па прадмету “ Вакальны ансамбль” ляжыць вывучэнне абласных пеўчых стыляў, глыбокае пранікненне ў выканаўчую традыцыю як мясцовую, так і гарадскую. Эфектыўнасць выкладання дысцыпліны ажыццяўляецца ва ўзаемадзеянні з такімі дысцыплінамі, як “ “Аранжыроўка беларускіх народных песен”, “Расшыфроўка беларускіх народных песен”, “Выканальніцкае майстэрства”,”Асновы сценруху, танец”.

Спевы ў ансамблі маюць сваю спецыфіку, якая зыходзіць з асаблівасцей творчага працэсу гэтага жанру. Фактам, які вызначае выканальніцкую спецыфіку вакальнага ансамбля, з’яўляецца творчае адзінства індывідуальнага і калектыўнага пачатку ў спевах. Гэта патрабуе ад спевака-ансамбліста павышаную адказнасць за ўзровень свайго майстэрства, так як у адрозненні ад харыстаў, удзельнікі ансамбля выконваюць сваю партыю ў шматгалоссі самастойна, што налагае на яго асаблівую адказнасць.

Мэта вучэбнай дысцыпліны “ Вакальны ансамбль” – даць будучаму спецыялісту неабходныя веды па засваенні традыцыйнай і сцэнічнай манер народных ансамблевых спеваў, па авалоданні навыкамі і ўменнямі раскрыцця вобраза народнай песні, выхаваць высокаадукаванага спецыяліста ў сферы народнапесеннага выканальніцтва.

Задачы курса:

-авалодаць практычнымі навыкамі і ўменнямі спеваў у ансамблі;

-сфарміраваць і развіць навыкі і ўменні выразных сцэнічных паводзін і акцёрскага майстэрства;

-прымяняць спецыфічныя прыёмы гуказдабывання ва ўмовах ансамблевых спеваў;

-авалодаць методыкай работы з вакальным ансамблем у працэсе практычнай работы з вучэбным калектывам;

-выхаваць выразна-асэнсаванае гукаўтварэнне праз размоўную манеру спеваў;

-засвоіць вакальную тэхніку і прымяняць яе пры раскрыцці мастацкага вобраза народнай песні;

-прывіць трывалыя веды па пытаннях вакальнай работы ў калектыве;

-сфарміраваць у будучых спецыялістаў мастацка-каштоўную арыентацыю па авалоданні прынцыпамі падбору рэпертуару і ўменні максімальна выкарыстоўваць яго ў выхаваўчай і педагагічнай рабоце.

Выпускнік павінен

**ведаць:**

-прынцыпы работы з вакальным ансамблем;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

-роўнае і плаўнае гукавядзенне;

-народную мелізматыку(прыдыхі,спады голасу, фаршлагі і г.д.);

-выканальніцкія асаблівасці розных рэгіёнаў Беларусі;

**умець:**

-сфарміраваць рэпертуар для вакальнага ансамбля;

-развіваць вакальна-тэхнічныя навыкі і ўменні, шукаць сваё выканальніцкае крэда;

-фарміраваць і выхоўваць творчую асобу.

Заняткі па “ Вакальнаму ансамблю” павінны прывіваць павагу і любоў да народнапесенных традыцый, самастойнасці выканання, развіваць навыкі практычнай работы ў ансамблі.

Важнай часткай вакальнага ансамбля з’уляецца канцэртна-выканальніцкая дзейнасць, якая дысцыплінуе і стымулюе навучальны працэс.. Неабходнай умовай дасягнення прафесійных вынікаў з’яўляецца ўважлівая і актыўная работа студэнтаў і патрабавальнасць выкладчыка да дакладнага выканання яго рэкамендацый на занятках. Яны маюць дакладную зместавую накіраванасць як для студэнтаў, так і для выкладчыка. Якасць гучання і выканальніцкая культура ўдасканальваюцца ў выніку сістэматычных рэпетыцый і канцэртнай дзейнасці. Рэкамендуецца праслухоўванне фоназапісаў народных выканаўцаў, запрашэнне выканаўцаў – носьбітаў традыцыйнага выканальніцтва на рэпетыцыі, якія дапамогуць у засваенні аўтэнтычнай манеры спеваў.

Для найбольш эфектыунага засваення матэрыяла па дысцыплине “ Вакальны ансамбль” ужываюцца вучэбна-даследчыя тэхналогии, якия прадугледжваюць вывучэнне дыялектных асабливасцей рэгиёнау Беларуси, прыёмы вымаулення паэтычнага тэксту и авалодванне народнай манерай спевау (мясцовыя пеучыя традыцыи, перайманне “з голасу”, сувязь спевау з асабливасцями дыялекта).

У адпаведнасці з тыпавым вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны “Вакальны ансамбль” усяго адводзіцца **224** гадзіны, з якіх **90** – аўдыторныя (практычныя) заняткі.

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў – залікі і экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН**

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўд.гадзін (практ.зан.) |
|---|---|
| Уводзіны | 1 |
| .Тэма 1. Тэхніка спеваў у вакальным ансамблі (гукаўтварэнне, кантыленнае гукавядзенне, адзіная манера спеваў, пеўчае дыханне) | 8 |
| Тэма 2. Пеўчая дыкцыя (нейтралізацыя галосных, работа над галоснымі і зычнымі) | 7 |
| Тэма 3. Выпрацоўка чыстай і дакладнай інтанацыі ў вакальным ансамблі (ансамбль і строй ) | 7 |
| Тэма 4. Рэгістровая палітра ансамблевага гучання (грудное, галаўное, змешанае, згладжванне рэгістравых пераходаў) | 8 |
| Тэма 5. Засваенне рэгіянальных прыёмаў народнага гукаўтварэння( асаблівасці дыялектаў) | 8 |
| Тэма 6. Аўтэнтычная народная манера спеваў | 7 |
| Тэма 7. Сцэнічная народная манера спеваў | 7 |
| Тэма 8. Музычна-выразныя сродкі і праца над стварэннем мастацкага вобразу беларускай народнай песні | 8 |
| Тэма 9. Авалоданне навыкамі імправізацыі ў вакальным ансамблі | 8 |
| Тэма 10.Авалоданне асновамі спеваў з элементамі руху | 8 |
| Тэма 11. Удасканаленне навыкаў народнай манеры спеваў у вакальным ансамблі | 7 |
| Тэма 12. Актыўны ўдзел у канцэртах, авалоданне выканальніцкім майстэрствам | 6 |

Усяго: 90

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

**Уводзіны.**

Вакальны ансамбль як жанр-шырока распаўсюджаная выканальніцкая форма народных спеваў, у якой сканцэнтраваліся і дасягнулі вышынь найбольш дасканалыя народна-пеўчыя выканальніцкія традыцыі Таму першаступеннымі задачамі навучання прадмету “ Вакальны ансамбль” з’яўляюцца пытанні навучання метадам і прыёмам, засваенне якіх садзейнічае падтрымцы і развіццю народных традыцый.У аснове вучэбнай работы па прадмету “ Вакальны ансамбль” ляжыць вывучэнне абласных пеўчых стыляў, глыбокае пранікненне ў выканаўчую традыцыю як мясцовую, так і гарадскую.Спевы ў ансамблі маюць сваю спецыфіку, якая зыходзіць з асаблівасцей творчага працэсу гэтага жанру. Фактам, які вызначае выканальніцкую спецыфіку вакальнага ансамбля, з’яўляецца творчае адзінства індывідуальнага і калектыўнага пачатку ў спевах. Гэта патрабуе ад спевака-ансамбліста павышаную адказнасць за ўзровень свайго майстэрства, так як у адрозненні ад харыстаў, удзельнікі ансамбля выконваюць сваю партыю ў шматгалоссі самастойна, што налагае на яго асаблівую адказнасць і за калектыўны вынік гучання вакальнага твору.Фальклорныя абразцы, якія ўваходзяць у рэпертуар ансамбля, даюць магчымасць практычна засвоіць разнастайнасць мясцовых стылявых выканальніцкіх традыцый, якія з’яўляюцца важным фактарам эстэтычнага выхавання выканаўцаў.Акрамя подлінных народна-пеўчых узораў, у рэпертуар вакальнага ансамбля ўключаюцца апрацоўкі і арыгінальныя аўтарскія творы, напісаныя для народных спевакоў без суправаджэння і ў суправаджэнні музычных інструментаў.

**Тэма 1**. **Тэхніка спеваў у вакальным ансамблі (гукаўтварэнне, кантыленнае гукавядзенне, адзіная манера спеваў, пеўчае дыханне).**

Замацаванне навыкаў якія засвоілі на сольных спевах і авалоданне новымі: выкананне ў аднародных і змешаных складах ансамбляў, пашырэнне дыяпазона ва ўмовах ансамблевых спеваў з выкарыстаннем нюансаў меццо форте і меццо піано. Адзіная манера выканання апора на гутарковы пасыл слова і гука. Моўныя інтанацыі і выканальніцкія прыёмы. Жанравая разнастайнасць беларускай народнай песні і яе ўплыў на народную манеру выканання. Гукаўтварэнне пры спевах калядных, веснавых, купальскіх песен. Асаблівасці гукавядзення ў веснавых загуканнях і веснавых карагодных песнях. Работа над пеўчым дыханнем “на апоры”, звязанае з тэмпам выконваемага твора і знаходжаннем правільнай песеннай пазіцыі пры гукаўтварэнні.

**Тэма 2. Пеўчая дыкцыя (нейтралізацыя галосных, работа над галоснымі і зычнымі).**

Выразнае вымаўленне тэксту як адно з самых важных сродкаў народна-выканальніцкага майстэрства. Праца над дакладнай дыкцыяй для перадачы тэксту песні, апора на лагічныя націскі і данясенне сэнсу песні да слухача. Нейтралізацыя галосных – аснова работы над адзінай манерай выканання. Дыкцыя – галоўны сродак данясення тэксту твора і важны сродак раскрыцця мастацкага вобраза. Тэхніка ўтварэння галосных і зычных гукаў у спевах. Цэласны размоўны спосаб спеваў. Практыкаванні для ўдасканалення і выпраўлення дыкцыі і артыкуляцыі.

**Тэма 3 Выпрацоўка чыстай і дакладнай інтанацыі ў вакальным ансамблі (ансамбль і строй).**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адзіная манера гукаўтварэння – неабходная ўмова дасягнення ўстойлівасці інтанацыі і чысціні строю. Фарміраванне вакальна-тэхнічных навыкаў у цеснай сувязі з развіццём музычнага слыху. Сувязь тэхнічных і мастацкіх бакоў выканання. Уменне спяваць свабодна, без напружання. Выяўленне індывідуальных недахопаў і шляхоў іх пераадолення.Складанасць работы пры выпрацоўцы навыкаў інтанавання ў спецыфічных ладах народнай музыкі і выкананні дыссанантных сугуччаў, якія ўзнікаюць дзякуючы лінеарнай імправізацыйнасці развіцця галасоў. Асэнсаванае інтанаванне музычна-паэтычнага тэксту твора. Спевы народных песень у аднагалосным і шматгалосным выкананні. Знаёмства з рознымі відамі і тыпамі ансамбляў.

**Тэма 4. Рэгістравая палітра ансамблевага гучання ( грудное, галаўное, змешанае, згладжванне рэгістравых пераходаў).**

Вольнае валоданне ўсімі рэгістрамі голасу. Замацаванне груднога гучання ў межах септымы, актавы для жаночых галасоў; актавы, дэцымы для мужчынскіх галасоў. Авалоданне навыкамі галаўнога і змешанага рэгістраў, сгладжванне трох рэгістраў. Выкарыстанне аднарэгістравых і двухрэгістравых партытур. Пашырэнне дыяпазону галасоў за кошт згладжвання рэгістраў пры захаванні тэмбравай яркасці.

**Тэма 5. Засваенне рэгіянальных прыёмаў народнага гукаўтварэння (асаблівасці дыялектаў)**

Знаёмства з асаблівасцямі дыялекту. Засваенне дыялектных асаблівасцей рэгёнаў Беларусі: Паазер’е, Панямонне, Падняпроў’е, Палессе. Вывучэнне спецыфікі вымаўлення і манеры выканання на прыкладах рэгіянальных неапрацаваных народных песень. Засваенне рэгіянальных прыёмаў гукаўтварэння: рэдуцыраванне галосных, расцягванні слоў на дадатковыя галосныя, паўторнасць складоў, арнаментыкі: слізганняў, прыгукаў, народных мелізмаў і мардэнтаў, глісандыруючых гукаў, спадаў, абрываў слоў і інш.

**Тэма 6. Аўтэнтычная народная манера спеваў.**

Знаёмства з аўтэнтычнай манерай спеваў. Ужыванне спецыяльных практыкаванняў для выпрацоўкі правільнага гукаўтварэння. Набыццё навыкаў і ўменняў спеваў аўтэнтычнага фальклору з захаваннем рэгіянальнай манеры выканання. Праслухоўванне фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу з мэтай яго засваення і ўзнаўлення. Праца над прыёмамі традыцыйнага народнага выканальніцтва – народнымі мелізмамі (фаршлагі, глісанда, скіды, закідванне голасу ўгару, гуканні, агласоўка зычных і інш.). Авалоданне мастацтвам спеваў без суправаджэння ў аўтэнтычнай манеры.

**Тэма 7. Сцэнічная народная манера спеваў**

Авалоданне на матэрыяле беларускіх народных песень сцэнічнай манерай народных спеваў. Спевы прыкрытым і паўпрыкрытым, акругленным гукам. Выпрацоўка адзінай манеры ансамблевага выканання. Праца над свабоднай артыкуляцыяй і дакладнай дыкцыяй. Літаратурнае вымаўленне тэксту народнай песні. Ансамблевае выкананне без суправаджэння і спевы з рознымі відамі суправаджэння (аркестравае, фанаграма-1). Выкарыстанне танцавальных рухаў у вакальным ансамблі. Прыёмы выкарыстання народнай харэаграфіі і пластыкі ў пастаноўцы лірычнай народнай песні і карагодаў.

**Тэма 8 Музычна-выразныя сродкі і праца над стварэннем мастацкага вобразу народнай песні.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Практыкаванні па выпрацоўцы розных відаў гукавядзення. Метрарытм і тэмп. Тэмбравыя фарбы і іх уплыў на стварэнне мастацкага вобраза песні. Дынаміка, асноўныя дынамічныя адценні і праца над імі. Фразіроўка і яе залежнасць ад тэксту твора. Музычна-вобразнае мысленне.

**Тэма 9. Авалоданне навыкамі імправізацыі ў вакальным ансамблі.**

Асновы імправізацыі. Развіццё пеўчых навыкаў імправізацыі. Уменне выкарыстоўваць варыянтнасць у незафіксаванай паслядоўнасці строф этнаграфічнага шматгалосся. Праца над авалоданнем складанымі навыкамі імправізацыі. Пабудова на аснове вывучаемага песеннага матэрыялу варыянтаў ніжняга, сярэдняга і верхняга голасу. Выхаванне ансамблевай выканальніцкай культуры: прыпяванне, пабудова падгалоскаў да асноўнага напеву і інш.

**Тэма 10. Авалоданне асновамі спеваў з элементамі руху.**

Знаёмства з асноўнымі элементамі народнай харэаграфіі. Авалоданне навыкамі і ўменнямі выкарыстання танцавальных рухаў у вакальным ансамблі. Работа над элементамі народнага танца ў песнях з рухам: просты і пераменны шаг, просты і трайны прытопы, шаг з прытопам, дробная сцежка, спалучэнне розных рытмаў пры выкананні адной песні. Рух “сценка на сценку”, па крузе, змейка, закручванне, смаўжок і інш.

Каардынацыя ўнутраных эмацыянальных пачуццяў са знешнімі (мімікай, выразнасцю рухаў, узаемадзеяннем у працэсе выканання). Сцэнічная інтэрпрэтацыя харэаграфічнага фальклору.

**Тэма 11. Удасканаленне навыкаў народнай манеры спеваў у вакальным ансамблі.**

Замацаванне і развіццё навыкаў і ўменняў, набытых раней, на новым матэрыяле песенна-танцавальнай традыцыі, апрацовак беларускіх народных песень. Спевы ў вакальным ансамблі больш складаных партытур з авалоданнем адзінай манеры гукаўтварэння. Праца над вакальнай тэхнікай складаных вакальных твораў. Авалодванне навыкамі выканання аўтарскіх твораў. Выпрацоўка навыкаў тэхнікі філіроўкі гуку. Развіццё гібкасці, рухомасці і палётнасці голасу.

**Тэма 12. Актыўны ўдзел у канцэртах, авалоданне выканальніцкім майстэрствам.**

Удасканальванне выканальніцкага майстэрства студэнта. Актыўная канцэртная дзейнасць. Удзел у конкурсах і фестывалях. Выкарыстанне ў сваёй творчай дзейнасці разнастайнага музычна-стылістычнага матэрыялу. Праяўленне тонкай музыкальнасці і мастацкага густу ў выкананні народнай песні патрабуецца ад будучага спецыяліста ў галіне народных спеваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА - МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

*Асноўная*

1. *Беларускі* фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць / укл. В.А. Захарава, Р.М. Кавалёва, В.Д. Ліцвінка. – Мн: Універсітэтскае, 1989. –с.128-320
2. *Беларускі* фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / укл. В.Д.Ліцвінка, Г.Д.Кутырова. – Мн: Універсітэтскае, 1995. – с.100-250
3. *Варфаламеева*, Т.Б. Песні Беларускага Панямоння / Т.Б.Варфаламеева. – Мн: Бел. Навука, 1980. – 220 с.
4. *Вянок* беларускіх народных песень / запіс у Раговіча. – Мн: Навука і тэхніка, 1988.- с.320-432
5. *Жніўныя* песні / рэд. А.С.Фядосік. – Мн: Навука і тэхніка, 1974. –с.120-340
6. *Мажэйка*, З Я Песні Беларускага Паазер'я / З.Я.Мажэйка. – Мн: Навука і тэхніка, 1981. – с.80- 120; с.300-480
7. *Мажэйка,* З.Я. Песні Беларускага Падняпроўя / З.Я.Мажэйка, Т.Б. Варфаламеева. – Мн: Бел. навука,1999. – 276 с.
8. *Можейко* ,З.Я. Песни Белорусского Полесья / З.Я.Можейко. – М.: Сов.композитор, 1983. – Вып 1. – 184 с.
9. *Можейко*, З.Я. Песни Белорусского Полесья / З.Я.Можейко. – М.: Сов. Композитор, 1984. – Вып.2. – 181 с.
10. *Можейко*, З.Я. Песенная культура Белорусского Полесья. Село Тонеж. – Мн.: Наука и техника, 1971. – 263 с.
11. *Эвальд* З.В. Песни Белорусского Полесья. – М.: Сов.композитор, 1979. – 120 с.

*Вучэбна-метадычная*

1. Грамовіч, І.М. Методыка работы з фальклорным гуртам: курс лекцый/ І.М. Грамовіч, Л.В. Снапкова.—Мн.: Бел.дзярж. ун-т культуры і мастацтваў.2009.-139с.
2. Дмитриев, Л.Б. Основы вокальной методики / Л.Б.Дмитриев. – М.: Музыка, 2000. – 367 с.
*3. Калугина*, Н.В Методика работы с русским народным хором: учебник для муз. Вузов / Н.В. Калугина, - М.: Музыка,1977. – 71с.
*4. Малышева,* Н.М. О пении / Н.М.Малышева. – М.: Сов. Композитор, 1988. – 135с.
5.Мешко, Н.К. Искусство народного пения: практическое руководство и методика обучения искусству народного пения / Н.К.Мешко. – М.: ЛУЧ, 2000. – 80 с.
*6.Менабени*, А.Г. Методика обучения сольному пению: Учебное пособие для пед. ин-тов. – М.: Просвещение, 1987. – 93с.
7.*Огороднов*, Д.Е. Воспитание певца в самодеятельном ансамбле. – Киев: Муз Украина, 1980. – 66с.

*Дадатковая*

1. *Крывіцкі,* А.А. Сучасная беларуская літаратурная мова і народныя гаворкі / Т-ва па распаўсюджванні паліт. І навук. ведаў БССР. – Мн.,1961. 40 с.
2.*Несцяровіч, Г.Д., Холупава, Л.І., Дубавец. А.І.* Ансамбль беларускай народнай песні: вучэб.дапам./ Г.Д. Несцяровіч,Л.І. Холупава, А.І. Дубавец.—Мн.: Бел.дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2006—152с.
3.*Холупава, Л.*І. Пастаноўка голасу і вакальны ансамбль:вучэб.дапам./Л.І. Холупава,І.М. Грамовіч, Л.Л. Ражкова.- Мн.: Бел.дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008—с.50-187с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.2 Метадычныя рэкамендацыі па авалоданні народнай манерай спеваў

Народнае мастацтва стваралася стагоддзямі. У выніку працяглага развіцця яно дасягнула высокай культуры і сфарміравалася як суцэльны мастацкі пласт, у якім народ глыбока і праўдзіва выказаў свой самабытны характар, духоўныя запыты і маральныя ідэалы. У народнай песні адлюстроўваецца гісторыя развіцця нацыі і дзяржавы. Яна стала свайго роду мастацкім летапісам побыту людзей.

Народная манера спеваў мае старажытную традыцыю. Народныя спевы ў мінулым выпрацоўваліся на аснове пераемнасці майстэртсва народных спевакоў з пакалення ў пакаленне. Дзякуючы такой пераемнасці , узніклі і развіліся сучасныя аматарскія і прафесійныя вакальныя школы. Склаліся характэрныя прыметы і асаблівасці нацыянальных выканальніцкіх стыляў.

Народная манера – гэта комплекс вакальна-выканальніцкіх сродкаў і прыёмаў, што склаліся на основе рэгіянальных гісторыка-культурных і мастацкіх традыцый пад уздзеяннем бытавога песеннага асяроддзя. Яна заснавана на асаблівасцях дыялектаў, музычнай мовы і выканальніцкага стылю шэрага пакаленняў народных спевакоў пэўнай мясцовасці.

Навучанне народнай манеры – складаная, неадназначная вырашаемая і мала вывучаная галіна народных спеваў.

Існуюць розныя методыкі пастаноўкі народнага голасу; яны выклікаюць спрэчкі ў асяроддзі выкладчыкаў-вакалістаў. Пранікненне ў сутнасць народнай песні немагчыма без вывучэння і засваення народнай выканальніцкай манеры, што спрыяе стылістычна дакладнай яе інтэрпрэтацыі. Сутнасць методыкі навучання спевам – у неабходнасці асэнсавання дакладных уяўленняў аб рабоце галасовага апарату, вывучэнні тыпаў песеннага дыхання, знаёмстве з творчасцю лепшых носьбітаў народнапесенных традыцый і прафесійных выканаўцаў народная песні.

Фальклорныя ансамблі шмат твораў выконваюць без суправаджання і пры інтанаванні абапіраюцца толькі на асабістыя слыхаваныя адчуванні і прадстаўленні ладатанальных гукавых зносін у мелодыі і гармоніі. У сувязі з гэтым вастрыня, дакладнасць і пэўнасць інтанацыі становяцца не толькі неабходным кампанентам выразнага выканання, але і сродкам умацавання харавога строю і адным з важнейшых якасцей прафесійнай тэхнікі спевакоў і дырыжора. Праца над горманічным і меладычным строем непасрэдна звязана з рзвіццём музыкальнага слыху. Удзельнікі вакальнага ансамбля павінны не

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

толькоправільна узнавіць мелодыю, але і чуць правільнасць гукаўтварэння. Вышыню пазіцыіі гуку, тэмбравы колер голасу. Гэта магчыма пры наяўнасці вакальнага слыху.

Праца над строем пачынаецца на першая стадыі прапявання. Нельга прапускаць памылкі ў інтанаванні. Для выпрацоўкі дакладная інтанацыі вельмі карысныя спевы сальфеджыо: прапяванне невялікіх кавалкаў мелодыі, нескладаных практыкаванняў ці харавых партый сальфеджыруючы, а потым со словамі.

Вялікую ролю у вакальным ансамблі іграюць гарманічны слых, уменне чуць свой тон у агульным гучанні шматгалосных спеваў. Спачатку для падтрымкі вакальных партый выкарыстоўваецца інструмент (баян, фартэпіяна). Меладычны малюнак партый вывучаецца паасобку, па тонах ці з голасу хормайстра. Калі спевакі набудуць пачатковыя навыкі, можна паступова пераходіць да спеваў без суправаджэння. Практыкаванні можна ўскладняць. Паступова ўскладняючы рэпертуар. Важны фактар стварання ўустойлівага строю – працэс упявання твораў, калі пры правільным паўторы ў шчыльнай сувязі з мастацка-выканальніцкімі задачамі ўстанаўліваюцца і замацоўваюцца слыхавыя ўяўленні і тэхнічныя прыёмы. Набываюцца неабходныя ўпэўненнасць і свабода ў выкананні.

Важнейшай умовай добрай інтанацыі з’яўляецца правільнае вакальнае выхаванне спевака. Недастатковая вакальна-тэхнічная падрыхтоўка робіць значны адбітак на якасці інтанавання. Нізкая пазіцыя гуку, фарсіраваны гук, гук без апоры, празмерная вібрацыя, пляскаты гук, гарлавое гучанне – тыя фактары. Якія шкодзяць зладжаным спевам.

*Адзіная манера гукаўтварэння.* Прафесійнае гучанне ансамбля немагчыма без выпрацоўкі адзіная манеры спеваў. Для чаго гэта патрэбна? Справа у тым, што голас спевака, які валодае адзінай манерай фарміравання гуку, адрозніваецца асаблівай роўнасцю тэмбравай афарбоўкі, адзіным каларытам гучання. Калі спявак не валодае адзінай манерай гукаўтварэння, яго голас гучыць пёстра і ўсе галосныя фарміруюцца па-рознаму. У вакальным ансамблі спявае калектыў спевакоў, і пытанне адзінай манеры спеваў набывае актуальнае і важнае значэнне, таму што ад гэтага залежаць харавы ансамбль і злітнасць гучання.

Пад адзінай манерай гукаўтварэння ці адзінага фарміравання гуку падразумеваецца правільнае гукаўтварэнне з аднолькавай ступенню акругленасці галосных. Інакш кажучы, кожны спявак павінен аднолькава правільна вымаўляць галосныя: чыста інтанацыйна, аднолькава па тэмбры, з аднолькавым правільным акругленнем. Негледзячы на тое, што народная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

манера спеваў характарызуецца як адкрытая, ступень акругленнасці павінна тут абавязкова прысутнічаць, каб пазбегнуць пляскатага, “белага” гучання.

Да дасягнення адзінай манеры спеваў неабходна фарміраванне “адкрытых” галосных *а (я). э (е), і, ы* па узоры “прыкрытых”. Тут карысна выкананне практыкаванняў на галосныя *у, ю, ё* і на склады *ду, ку, лю, лё.* “Адкрытыя” галосыя масленна карэкціруюцца на “прыкрытыя”. Напрыклад, спяваем *а,* думаем *о*; спяваем *і,* думаем *ю*; спяваем *е,* думаем *ё* і інш. Такая масленная праца на “акругленне” дае эфект адзінай афарбоўкі выконваемых галосных і ўвогуле гучанне вакальнага ансамбля абывае характар роўнасці і згладжаннасці ў гукавядзенні. Асабівая адметнасць акруглення гуку ў тым, што гэты прыём (акруглення) павінен быць ледзь прыметным і не перашкаджаць яскраваму, светламу, адкрытаму і блізкамугукаўтварэнню. А вось мяжу ступені акругленнасці ў характары гуку неабходна распазнаць на слых, каб вакальна пісьменна арыентаваць спевакоў.

Прыём акруглення неабходны спевакам і для таго, каб пераадолеь рэгістравую перабудову голасу. Вядома, што найбольшую цяжкасць для выканаўцы ўяўляе пераход  аднаго рэгістра ў другі. Г.тая цяжкасць узнікае пры выканнані песень вялікага дыапазону. У гэтым выпадку спевакі абавязкова выкарыстоўваюць прыём акруглення, тым самым дапамагаючы перабудаваць свій голас на другі рэгістр ( напрыклад, перайсці з груднога рэгістра ў змешаны – мікставы, а з яго – ў галаўны). Калі спевакі вакальнага ансамбля ўмела аб’ядноўваюць рэгістры сваіх галасоў, спевы набываюць высокапрафесійнае гучанне.

Выпрацоўка адзінай манеры гукаўтварэння, якая падразумевае адзіную афарбоўку галосных з пэўнай ступенню іх акругленнасці, а таксама спевы на аб’яднанне рэгістравывх пераходаў голасу забяспечваюць правільную арыентаванасць у творчай працы фальклорнага вакальнага ансамбля.

*Рэпертуар народнага спевака.* Рэпертуар вызначае творчы твар любога спевака. Для выканаўцы народнай песні ён мае прынцыповае значэнне, таму што раскрывае асаблівасці народнага вакальнага жанру. Беларуская народная песня – аснова дадзенага віду выканаўства. Яна мае вялікае выхаваўчае значэнне, прывівае патрыятычныя пачуцці, адлюстроўвае найбольш жыццяўстойлівыя якасці чалавека, паважаныя адносіны да сваіх нацыянальных традыцый, да фальклору. Галоўная задача выканаўцы народнай песні – прапаганда лепшых узораў народнапесеннай творчасці, старадаўніх і сучасных традыцыйных, апрацаваных народных песень, а таксама твораў беларускіх кампазітараў, напісаных для народнага голасу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нягледзячы на тое, што зацікаўленнасць народнапесеннымі традыцыямі ўзрастае, народнае песеннае выканаўства ва ўсёй яго шматграннасці застаецца малавядомым шырокім масам слухачоў. Калі улічваць, што народнапесенная творчасць пастаянна развіваецца, становіцца асабліва зразумелым неабходнасць актыўна вывучаць і прапагандзіраваць усё лепшае, што назапашанастагоддзямі і што на сучасным этапе ствараецца і захоўваецца таленавітымі выканаўцамі народнай песні, удзельнікамі аматарскіх калектываў і прафесійнымі спевакамі.

Вядома, што шмат песень застаецца ў памяці народных выканаўцаў, так званых носьбітаў традыцый. Гэтыя ўзоры народнапесеннага мастацтва паступова знакаюць з быту. Пажадана, каб сучасны выканаўца народнай песні вёў сваю фанатэку, дзе запісваліся б лепшыя ўзоры песеннага фальклору.

Мы нездарма звяртаемся да значнасці фарміравання рэпертуару. Справа ў тым, што праблема эстэтычнага кшалту ў выканальніцкім майстэрстве спевака заўсёды была і будзе асноватворнай. Рэпертуар уздзейнічае на ўвесь вучэбна-выхаваўчы працэс. На яго базе назапашваюцца музычна-тэарэтычныя веды, выпрацоўваюцца вакальна-тэхнічныя гавыкі і ўменні, складваецца мастацка-выканальніцкі кірунак творчай асобы, фарміруецца мастацка-вобразнае мысленне. Пытанне падбору рэпертуару з’яўляецца галоўным у дзейнасці выканаўцы. Ад умелай працы з песенным матэрыялам залежаць прафесійны рост студэнта – будучага спевака, перспектывы развіцця яго як творчай асобы, як захавальніка і прапагандыста беларускага песеннага фальклору.

Здача репертуару – развіваць і ўдасканальваць музычна-вобразнае мысленне студэнта, яго творчую актыўнасць. Гэта магчыма ў тым выпадку, калі выкладчык прытрымліваецца прынцыпаў падбору рэпертуару і ўмела іх выкарыстоўвае ў вучэбнай дзейнасці.

Адзін с прынцыпаў – *ад простага да складанага.* Мэтазгодна ўключаць у рэпертуары план творы, якія дапамагаюць вырашаць канкрэтныя вучэбныя задачы, а таксама нескладаныя народныя творы, напрыклад каляндарна-абрадавыя народныя песні, такія як “Ой, лета ж маё, лета”, “Вісна, хадзі ў двору”, “Напішу, напішу на паперачку” і інш. Дасягнуўшы пэўных вынікаў у засваенні песеннага матэрыялу, выкладчык падбірае аўтарскія творы, напісаныя для народнага голасу, для вырашэння больш складаных выканальніцкіх задач.

*Прынцып індывідуальнага і дыферэнцыраваннага падыходу.* Кожны студэнт, па-першае, надзелены ад прыроды сваімі спецыфічнымі галасавымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якасцямі і музыкальмі здольнасцямі, па-другое, мае рознуювакальную падрыхтоўку. Вельмі важна “ не нашкодзіць” і падабраць рэпертуар, які б адпавядаў асаблівасцям студэнта-спевака. Індывідуальны падход карысны тым, што дазваляе зрабіць разнастайнай рэпертуарную палітыку і для кожнага студэнта выбраць адпаведныя яго голасу і музыкальным здольнасцям народныя творы.

*Прынцып засваення манеры спеваў з выкарыстаннем рэгіянальных народных песень.*Народны выканаўца павінен азнаёміцца з рэгіянальнымі выканальніцкімі стылямі, што існуюць у Беларусі. Для гэтага выкладчык павінен уключыць у яо вучэбную дзейнасць народныя песні кожнага песеннага рэгіёна.

*Прынцып развіцця вакальна-тэхнічных навыкаў і ўменняў.*Выкладчык, працуючы са студэнтамі у класе над авалодваннем вакадбнай тэхнікі, мэтанакіравана падбірае рэпертуар, каб пераадолець пэўныя вакальна-тэхнічныя цяжкасці і дабіцца якаснага выканання песні.

*Прынцып вобразна-мастацкага асэнсавання*выконваемага твора прадугледжвае фарміраванне ў выканаўцы народнай песні творчага ўяўлення. Мастацкага густу, акцёрскага майстэрства. Рэалізацыя названнага прынцыпу дазваляе студэнту-спеваку навучыцца асэнсавана выразна выконваць народную песню, пранікнуцца ў яе паэтычны і меладчны тэкст, праўдзіва перадаць развіццё сюжэта.

*Прынцып усебаковага развіцця творчай асобы выканаўцы беларускай народнай песні.*Прайшоўшы поўныпяцігадовы курс навучання, студэнт назапашвае вялікі багаж песеннага матэрыялу. Глыбокае вывучэнне народнапесеннага мастацтва, методыкі пастаноўкі голасу, народнай творчасці, музычна-тэарэтычныя курсы, а таксама актыўная канцэртная дзейнасць дазваляюць упэўніцца, што гэта ўжо творчая асоба, якая можа самастойна вызначыць свій выканальніцкі кірунак і выбраць адпаведныя песні ў свой рэпертуар.

Што павінен улічваць спявак пра падборы рэпертуару? Рэпертуар павінен быць разнастайным па жанры, стылі, тэматыцы, вакальна-тэхнічным і мастацкім узроўні. Істотнай рэпертуарнай карцінай з’яўляюцца каляндарна-абрадавыя, сямена-бытавыя і пазаабрадавыя беларускія народныя песні.шмат песень зафіксавана навукоўцамі-фальклярыстамі Т.Б. Варфаламеевай, З.Я. Мажэйка, У.І. Раговічам, Г.І. Цітовічам, З.В. Эвальд, В.І. Ялатавым і інш. яскравая меладычнасць, рытмічная гібкасць, багацце інтанацыйных і дынамічных адценняў, вобразаў і сюжэтаў, вакальная зручнасць – гэтыя якасці робяць народную песню незаменным матэрыялам для школы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народных спеваў. Знаёмства з запісамі фальклорнага матэрыялу дазваляе студэнтам-спевакам не толькі ўзбагачаць свій рэпертуар, але і вывучаць мясцовую традыцыю спеваў.

Безумоўна, не ўсе ўзоры, што бытуюць у народзе і запісаны фалькларыстамі, можна спяваць.падбор традыцыйных твораў павінен ажыццяўляцца па іх ідэйна-мастацкім змесце. Тыя з іх, што маюць прыгожую мелодыю, добры тэкст, могуць прыцягнуць увагу спевака. Прапаганда народных песень як у арыгінале, так і ў апрацаваным выглядзе мае прынцыповае значэнне для творчасці выканаўцы народнай песні, паколькі народная песня больш даступная і зразумелая слухачу.

Рэпертуар павінен быць разнастайным па тэматыцы, жанрах выконваемых твораў і іх стылістычных асаблівасцях, мастацкіх сродках музычнай мовы. Разнастайныя па тэматыцы і коле вобразаў творы павінны падбірацца ў такім спалучэнні, каб магчыма было іх скласці ў цэльную кампазіцыю.

Пры падборы рэпертуару для выканаўцы народнай песні асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на песні без суправаджэння (a cappella). Гэтыя формы выканання заўсёды складала адну з каштоўнейшых нацыянальныхасаблівасцей беларускай школы народных спеваў. Спевы a cappella патрабуюць ад спевака высокай выканальніцкай культуры, тэхнічнага майстэрства і аказваюць моцнае эмацыянальнае ўздзеянне не толькі на слухачоў, але і на саміх выканаўцыў. Магчымасці спеваў без суправаджэння вельмі вялікая. Яны павінны складаць значную частку вучэбнага рэпертуару студэнта-спевака. Неабходна вельмі сур’ёзна адносіцца да авалодання гэтай формай выканаўства як асноўнай і самай складанай на шляху далейшага  вакальнага навучыння. Спявак выпрацоўвае вакальную тэхніку, удасканальвае чыстую інтанацыю, слыхавую ўвагу, пачуццё ладу, меладычны слых. Спевы без суправаджэння дазваляюць адчуць выразнасць чалавечага голасу, яго тэмбральны колер, характар гукавядзення, здольнасць закрануць самыя патаемныя пачуцці. У першую чаргу гэта песні каляндарна-абрадавыя: “Вісна, хадзі ў двору”, “Няхай будзе пагодачка”, “Ай, шла Купалка”, “А ў цёмным лесе мядзведзь рыкае”, балады “Із-пад каменя”, “Што за лесам, за лясочкам”, “Ой, павей, павей, буен вецярочак”, лірычныя “Ночы мае, ночушкі”, “Дробна пташачка невялічанька” і інш.

Асобнае месца ў рэпертуары народнага спевака займаюць апрацоўкі беларускіх народных песен. У нашым дапаможніку яны прадстаўлены ў апрацоўках І. Грамовіч, А. Казака, А. Кашпура, Л. Ражковай, М. Сіраты, Л. Холупавай. Яскравыя ў вобразным выражэнні песні “Ой, у лузе каліна”

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(апр. А. Казака), “А ў лесе грыбы зарадзілі” (апр. І. Грамовіч), “Ю ў нядзельку рано” (апр. Л. Ражковай), “Із-пад каменя” (апр. А. Кашпура) і інш.

Значная частка ў дапаможніку адведзена песням з суправаджэннем. Гэта ў асноўнымпесні танцавальнага і жартоўнага характару, дзе патрабуецца раскрыццё артыстычных даных выканаўцы. Сярод іх такія беларускія народныя песні, як “Ключыкі”, “Ой, за гаем, гаем”, “Я ў нядзелю п’ю, п’ю”, “Хацеў мілы чарнабрывы”, “Ужо я ўстану раненька”, “Як паехаў мой міленькі” і інш.

Народная песня – жывая, творчая з’ява. Яна ўзбагачаецца ва ўзаемадзеянні з творчасцю кампазітара. У гэтых адносінах цікавымі ўяўляюцца работы беларускіх кампазітараў, якія вельмі тонка адчуваюць стылістыку, гарманічны склад песеннага фальклору і прыроду народнага голасу. Яскравыя і запамінальныя музычныя творы напісаны Л. Захлеўным, Л. Мурашкай, Э. Наско, У. Сарокіным, Ю. Семянякам,М. Сіратой, А. Чыркуном, самадзейным кампазітарам Я. Дзеравянкам. Практыка стварэння песень для народнага голасу паказвае, што яны становяцца жыццёвымі і даўгавечнымі тады, калі не толькі перадаюць пачуцці народа, але і абапіраюцца на музычна-мастацкую традыцыю.

*Інтэрпрэтацыя беларускай народнай песні*. Немалаважнымі задачамі на занятках па пастаноўцы голасу з’яўляюцца навучанне перадачы сутнасці выконваемага твора, стварэнне багатых праўдзівых вобразаў. Студэнт-спявак павінен не толькі тэхнічна добра выканаць песню, але пастарацца як мага лепш раскрыць і перадаць ідэйна-мастацкі вобраз праз сваю інтэрпрэтацыю.

Абыякавая перадача мелодыі і тэксту, інакш кажучы, спевы дзеля таго каб проста праспяваць, пакідаюць дрэнныя ўражанні, нягледзячы на наяўнасць у выканаўцы добрых галасавых дадзеных і ўмела падабранага рэпертуару. Такое выкананне не можа мець ніякай мастацкай каштоўнасці і не можа прынесці эстэтычную асалоду слухачу.

Інтэрпрэтацыя народнай песні і творчы падыход да яе выканання – няпростая задача. Авалоданне майстэрствам “падачы” песні вядзецца на працягу ўсяго навучання і ў далейшым творчым жыцці выканаўцы. Гэты працэс уключае ў сябе агульнае эмацыянальнае становішча спевака, яго псіхалагічны склад характару, жыццёвы вопыт, агульную і прафесійную адукаванасць а таксама асабісты густ, музыкальнасць, светапогляд, веданне народна-песенных традыцый, акцёрскае майстэрства.

Шматлікія крыніцы па праблемах музычнай педагогікі апісваюць розныя кірункі па авалоданні мастацка-вобразнай перадачай выконваемага твора. Найбольш аўтарытэтнымі, на наш погляд, з’яўляюцца прынцыпы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

К.С. Станіслаўскага, заснаваныя на выхаванні сапраўды праўдзівага, свабодна і шчыра дзебчага акцёра. К.С. Станіслаўскі валодаў абсалютным рэжысёрскім слыхам, абсалютным пачуццём “сцэнічнай праўды” і калі на рэпетыцыях гучала знакамітае “не веру”, пошукі сцэнічнай праўдай працягваліся. Асновай творчага метаду К.С. Станіслаўскага з’яўляецца пранікненне ва ўнутраны свет музыкі, пераўтварэнне яго акцёра ў сцэнічнае дзеянне, якое накіроўвалася на праўдзівае адлюстраванне пастаўленай сцэнічнай задачы.

Для народнапесеннага мастацтва праўдзівая інтэрпрэтацыя патрабуе глыбокага і ўдумлівага разумення тэксту і мелодыі народнай песні. Дасканалае вывучэнне жанравай прыналежнасці, стылёвых асаблівасцей і асаблівасцей мовы, азнаямленне з фоназапісамі, калі яны існуюць, непасрэдныя зносіны з носьбітамі фальклорных традыцый – тыя шляхі, якія дапамогуць народнаму выканаўцу ўзбагаціць унутраны светапогляд, пашырыць веды, пераняць манеру спеваў, стварыць умовы для творчай працы.

Некаторыя выканаўцы лічаць, што такі разбор народнага твора ці аўтарскай песні не патрэбен і разлічваюць толькі на асабістыя адчуванні і вопыт. Аднак асэнсаванне ідэйнага зместу народнай песні, удумлівае чытанне тэксту дапамагаюць перадаць не толькі голасам, але сэрцам і душою. Беражлівыя адносіны да слова і музыкі дазволяць правільна зразумець сэнс народнай песні.

Працу над мастацка-вобразным увасабленнем песні аблягчае трактоўка музычнага тэксту, у якім закладзены характар выканання, тэмпарытм, дынамічныя адценні. Творчая праца над інтэрпрэтацыяй народнай песні палягчаецца тым, што стваральнік песні (народ ці кампазітар) ужо пабудаваў умовы для ўзнаўлення свайго твора, і выканаўцу застаецца толькі “адрэдагаваць” прапанаваны матэрыял. Майстэрства спевака – гэта ўменне валодаць рознымі відамі гукавядзення і вакальна-тэхнічнымі прыёмамі, умела выкарыстоўваць тэмбравыя адценні і дынаміку. Праца над народная песняй адбываецца на падставе асэнсаванага падыходу да вакальнай культуры і фарміруецца праз суб’ектыўныя алносіны да яе выканання.

Такім чынам, творчы працэс над інтэрпрэтацыяй народнай песні падзяляецца на некалькі этапаў:

1. развіццё выканальніцкіх якасцей (авалоданне народна-выканальніцкімі прыёмамі, выхаванне артыстычнай індывідуальнасці, праца над элементамі пластыкі, над рэпертуарам);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. праца над развіццём драматургіі песні, выяўленне творчай індывідуальнасці выканаўцы, самастойная праца над рэпертуарам, спроба імправізацыі і самастойная рэжысура песні;

3. фарміраванне артыста-спевака ў рамках ВНУ (выхаванне творчай асобы выканаўцы беларускай народнай песні, яго ідэйна-мастацкага вобліку, шліфоўка і далейшае развіццё вакальна-тэхнічных навыкаў і ўменняў, пастаянны пошук свайго выканальніцкага крэда, актыўны ўдзел у канцэртах, фарміраванне свайго рэпертуару);

Адным з асобных спосабаў мастацкай выразніцы ў народных песнях з’яўляецца існаванне прыродных вобразаў-сімвалаў, пабудаваных на іншасказанні. Надзвычай важнае месца займаюць вобразы прыроды ў лірычных песнях і песнях-баладах. Эмацыянальную блізкасць, якую адчувае чалавек паміж сабой і прыродай, заўсёды вызначалі даследчыкі песеннага фальклору. Але галоўная прычына звароту да апісання прыгажосці прыроды – гэта каханне, якое пераўтварае свет, робіць чалавека чароўным і непаўторным. Такое светаўспрыманне паўплывала на выкананне любоўна-лірычных песень.

“Із-пад каменя” – вядомая беларуская народная песня. У яе кампазіцыйную структуру ўваходзіць маналог дзяўчыны, што раскрывае ідэйны змест песні.

Мелодыя пачынаецца з верхніх гукаў дыяпазону і развіваецца няспешна. Прыгожы малюнак прыроды адлюстроўваецца ў мяккай падачы мелодыі адпаведным ціхім гукам і плаўным гукавядзеннем. Спявачка манерай сваіх спеваў павінна перадаваць хараство і прыгажосць рэчанькі, увесці слухача ў чысціню сваіх пачуццяў і перажыванняў. Такога эмацыянальнага становішча неабходна дабівацца, працуючы над дынамічнымі адценнямі гуку, пры спевах ад piano у першым куплеце да forte ў перадапошнім. Такую версію інтэрпрэтацыі твора падказвае драматургія песні: жонка просіць мужа не толькі яе “рана з вечара”, а “познай ночанькай”, каб не ведалі людзі. Сямейны канфлікт і ўвогуле драматызм сітуацыі спявачка перадае гучнымі спевамі. Такая кульмінацыя вельмі дакладна адлюстроўвае напружаны, эмацыянальны стан гераіні песні.

Цікавасць уяўляе беларуская народная песня “Ой, калі ж той вечар”. Закаханая дзяўчына чакае вечара, каб сустрэцца са сваім любімым. Ніякія перашкоды не могуць парушыць сустрэчу. Пачуцці дзяўчыны перадаюцца праз роўнае, мяккае гучанне голасу. Апавядальны характар песні не патрабуе якіх-небудзь нюансавых пабудоў. Паўпрыкрытая падача гуку павінна адлюстроўваць самыя патаемныя мары дзявочай душы, яе сардэчныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

перажыванні. Просты меладычны малюнак дазваляе захоўваць роўнае і кантыленнае гукавядзенне на працягу ўсіх спеваў.

“Ой, за гаем, гаем” - вясёлая жартоўная. Няўдалая дзяўчына не можа сама ўзараць поле і наймае музыкантаў. Музыканты зачараваныя прыгожай дзяўчынай, ім падабаюцца яе чорныя бровы і белы тварык.

Жартоўна-апавядальны характар песні адбіваецца на манеры выканання і эмацыянальным настроі. Напрыклад, пажадана пачаць песню павольна і першую страфу закончыць доўгім гучным фермата. Працяглыя спевы высокай ноты дазваляюць спявачцы паказаць магчымасці свайго голасу. Далейшае развіццё падзей перадаецца праз лёгкія спевы з дакладнай дыкцыяй і жартоўным характарам выканання, якія падмацоўваюцца танцавальнымі рухамі.

“Няхай будзе пагодачка” і “Ой, лета ж маё, лета” – жніўныя песні. Яны спяваюцца роўным, моцнам, насычаным гукам.належнасць узнятага настрою і выразная падача слова ствараюць аснову для такога гукаўтварэння. Адкрытая манера спеваў прадугледжвае рэдуцыраванае вымаўленне галосных. Асаблівы каларыт надае спевам гэтых песень ужыванне “гульні голасам”: слізганні, прыгукі і зацягванне з кароткім глісанда ў канцы строф. Дынамічныя адценні ў такіх творах можна не ўжываць. Умелае ўпляценне акцёрскага майстэрства ў раскрыццё вобраза песень іх упрыгожыць і зробіць больш каштоўнымі ў эстэтычных адносінах.

Творчая праца над інтэрпрэтацыяй беларускай народнай песні – працэс працяглы і складаны. Гэта пастаянны пошук новых рашэнняў у стварэнні вобразаў, праца над голасам і яго тэмбральнымі фарбамі, над выразнасцю пачуццяў праз акцёрскае майстэрства, а таксама асэнсаванае разуменне і правільная трактоўка тэксту песні. Сапраўднае выкананне народнай песні залежыць ад творчай фантазіі і мастацкага густу выканаўцы. Поспех прыходзіць да таго, хто хоча працаваць, вывучаць народнапесенную спадчыну.

Чым вышэй мастацкі ўзровень выканання, тым больш моцнае эстэтычнае ўздзеянне выканаўцы на слухача, а значыць, больш магчымасцей для яго эстэтычнага выхавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**5.3 Асноўная літаратура**

1. *Беларускі* фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць / укл. В.А. Захарава, Р.М. Кавалёва, В.Д. Ліцвінка. – Мн: Універсітэтскае, 1989. –с.128-320
2. *Беларускі* фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / укл. В.Д.Ліцвінка, Г.Д.Кутырова. – Мн: Універсітэтскае, 1995. – с.100-250
3. *Варфаламеева*, Т.Б. Песні Беларускага Панямоння / Т.Б.Варфаламеева. – Мн: Бел. Навука, 1980. – 220 с.
4. *Вянок* беларускіх народных песень / запіс у Раговіча. – Мн: Навука і тэхніка, 1988. – с.320–432
5. *Жніўныя* песні / рэд. А.С.Фядосік. – Мн: Навука і тэхніка, 1974. – с.120–340
6. *Мажэйка*, З Я Песні Беларускага Паазер'я / З.Я.Мажэйка. – Мн: Навука і тэхніка, 1981. – с.80- 120; с.300-480
7. *Мажэйка,* З.Я. Песні Беларускага Падняпроўя / З.Я.Мажэйка, Т.Б. Варфаламеева. – Мн: Бел. навука,1999. – 276 с.
8. *Можейко* ,З.Я. Песни Белорусского Полесья / З.Я.Можейко. – М.: Сов.композитор, 1983. – Вып 1. – 184 с.
9. *Можейко*, З.Я. Песни Белорусского Полесья / З.Я.Можейко. – М.: Сов. Композитор, 1984. – Вып.2. – 181 с.
10. *Можейко*, З.Я. Песенная культура Белорусского Полесья. Село Тонеж. – Мн.: Наука и техника, 1971. – 263 с.
11. *Эвальд* З.В. Песни Белорусского Полесья. – М.: Сов.композитор, 1979. – 120 с.

**5.4 Вучэбна-метадычная**

1. Грамовіч, І.М. Методыка работы з фальклорным гуртам: курс лекцый/ І.М. Грамовіч, Л.В. Снапкова. – Мн.: Бел.дзярж. ун-т культуры і мастацтваў.2009.-139с.
2. Дмитриев, Л.Б. Основы вокальной методики / Л.Б.Дмитриев. – М.: Музыка, 2000. – 367 с.
3. *Калугина*, Н.В Методика работы с русским народным хором: учебник для муз. Вузов / Н.В. Калугина, - М.: Музыка,1977. – 71с.
4. *Малышева,* Н.М. О пении / Н.М.Малышева. – М.: Сов. Композитор, 1988. – 135с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5.Мешко, Н.К. Искусство народного пения: практическое руководство и методика обучения искусству народного пения / Н.К.Мешко. – М.: ЛУЧ, 2000. – 80 с.
*6.Менабени*, А.Г. Методика обучения сольному пению: Учебное пособие для пед. ин-тов. – М.: Просвещение, 1987. – 93с.
*7.Огороднов*, Д.Е. Воспитание певца в самодеятельном ансамбле. – Киев: Муз Украина, 1980. – 66с.

**5.5 Дадатковая літаратура**

1. *Крывіцкі,* А.А. Сучасная беларуская літаратурная мова і народныя гаворкі / Т-ва па распаўсюджванні паліт. І навук. ведаў БССР. – Мн.,1961. – 40 с.
2.*Несцяровіч, Г.Д., Холупава, Л.І., Дубавец. А.І.* Ансамбль беларускай народнай песні: вучэб.дапам./ Г.Д. Несцяровіч,Л.І. Холупава, А.І. Дубавец. – Мн.: Бел.дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2006. – 152 с.
3.*Холупава, Л.*І. Пастаноўка голасу і вакальны ансамбль:вучэб.дапам. / Л.І. Холупава, І.М. Грамовіч, Л.Л. Ражкова. – Мн.: Бел.дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – с. 50–187

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ